развіваючага навучання, што пераарыентуе студэнта з рэпрадуктыўнай дзейнасці на навукова-даследуючую.

---

*Алчнов В.И., Купцов А.Н.* Рейтинг-контроль успеваемости курсантов // Высшее образование в России. – 1998. – № 1. – С.95–96.

*Гладковский В.И.* Рейтинговые технологии в управлении системами педагогического процесса в высшей школе // Адукацыя і выхаванне. – 2000. – № 5. – С.13–18.

*Кананович А.П., Козубовский В.М.* Методология проектирования рейтинговых систем в сфере образования // Образование XXI века. Проблемы повышения квалификации работников образования: Тез. докл. междунар. конф. (14–16 дек. 1993 г., Минск).– Мн., 1993. – С.47–48.

*В.М.Наумчык*

## РЭЙТЫНГАВАЯ СІСТЭМА Ў ПЕДАГАГІЧНЫМ ПРАЦЭСЕ

Рэйтынгавая сістэма з'яўляецца адным з інструментаў удасканалення працэсу навучання і выхавання студэнцкай моладзі. Але роля педагога была і застаецца вызначальнай у гэтым працэсе.

Важнае значэнне ў павышэнні эфектыўнасці работы ВНУ належыць мэце. Мэту мае студэнт, мэты ставяць яго сям'я, універсітэт, грамадства, дзяржава. Рэйтынгавая сістэма дапамагае дасягненню пэўных мэт і вырашэнню пэўных задач. На першым курсе актуальнай з'яўляецца задача адаптацыі былога абітурыента да ўмоў ВНУ, з кожным курсам задачы ўскладняюцца, і рэйтынг павінен ім адпавядаць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ядром педагагічнага працэсу з'яўляецца самастойная работа студэнта. Немагчыма падрыхтаваць спецыяліста, калі ён не гатовы да напружанай самастойнай работы. Яшчэ старажытныя філосафы сцвярджалі, што каня можна падвесці да вады, але прымусіць яго піць немагчыма. Асоба педагога адыгрывае выключную ролю ў арганізацыі самастойнай работы студэнта. Для яго педагог асацыіруецца не толькі з прадметам, які ён выкладае, але і з самой навукай. Таму важна, каб педагог не толькі добра ведаў свой прадмет і добра выкладаў яго, але каб ён з'яўляўся для студэнта ўзорам вучонага, даследчыка, выхаванага і сціплага чалавека.

У наш час, на жаль, у педагагічным працэсе прысутнічае прымус. Без прымусу студэнты не будуць хадзіць на заняткі, не будуць у тэрмін здаваць экзамены і залікі, выконваць усё тое, што стварае падмурак добрых ведаў. На наш погляд, выхаванне без насілля – гэта педагагічная сістэма, у якой знешні ціск паступова змяншаецца, прымус перастае выконваць ролю жыццёвага рэгулятара. Замест знешняга ціску выпрацоўваецца іншы рэгулятар – унутраны, ён больш эфектыўны. Лічым, што ў гэтым вялікі сэнс выхаваўчай работы. Унутраны механізм рэгулявання ўсяго жыцця чалавека – аснова яго творчай і плённай працы.

Для эфектыўнасці вучэбнай і выхаваўчай работы выкарыстоўваюцца розныя метады навучання: праблемны, праграміраванага навучання, модульны і інш. Але яны выконваюць сваю ролю, калі працуе сам студэнт. А калі ён не хоча? Тут на дапамогу можа прыйсці рэйтынг. Апошні можа дапамагчы ў многім. Да рэйтынгу трэба быць падрыхтаваным. Гэта задача ВНУ, выкладчыкаў кафедры, перш за ўсё выкладчыкаў курса «Уводзіны ў спецыяльнасць». У кожным ВНУ, на пэўным факультэце ці кафедры выпрацоўваецца свой рэйтынгавы рэгламент – сістэма правілаў ці палажэнняў, па якіх адбываецца налічэнне студэнтам балаў па кантралюемых відах вучэбных заняткаў за выкананую імі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучэбную працу ў семестры. Рэйтынгавы рэгламент вызначае форму навучання — сістэмную арганізацыю педагагічнага працэсу ў адзінстве ўсіх яго кампанентаў. Рэйтынгавы рэгламент і рэйтынгавая сістэма эфектыўна працуюць, калі ацэньваюцца шматлікія бакі дзейнасці студэнтаў: на лекцыях, практычных і лабараторных занятках, у творчай лабараторыі; вынікі кантрольных зрэзаў, дадатковыя творчыя заданні, курсавыя работы, узаемадапамога, вытворчая і педагагічная практыка і інш.

Адзначым станоўчыя рысы рэйтынгавай сістэмы:

– індывідуалізацыя работы;

– тэмп работы студэнт выбірае самастойна;

– студэнт вучыцца вызначаць свае перспектыўныя мэты;

– узрастае адказнасць за вынікі сваёй працы;

– «празрыстасць» стану ўсебаковай падрыхтоўкі спецыяліста;

– неабходнасць актывізаваць свой творчы патэнцыял;

– раўнамернае размеркаванне працы на працягу семестра;

– выхаванне асноўных якасцей лідэра;

– фарміраванне адэкватнай самаацэнкі студэнта як спецыяліста;

– наладжванне міжасобасных зносін, накіраванасць на вынік;

– аператыўная зваротная сувязь у вучэбным працэсе.

Адмоўныя якасці рэйтынгавай сістэмы:

– працэс набору балаў можа пры некаторых умовах адарвацца ад змястоўнага боку адукацыі, навучанне пераходзіць у гонку за баламі, змест навучання губляе сваю прыярытэтнасць. Тут абавязкова неабходна педагагічная карэкцыя дзейнасці студэнтаў;

– неабходнасць у дадатковай вучэбна-метадычнай рабоце выкладчыка;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– скрытае насілле, якое ва ўмовах педагагічнага супрацоўніцтва змяншаецца і студэнт самастойна рэгулюе сваю творчую дзейнасць;

– напружанасць у зносінах студэнта з калегамі, асабліва з тымі, каму пашанцавала набраць больш балаў;

– ва ўмовах рэйтынгавай сістэмы цяжэй выхоўваць калектывізм, таму ў рэйтынгавым рэгламенце трэба абавязкова прадугледзець прэміяльныя балы за ўзаемадапамогу ў навучанні;

– рэйтынг эфектыўны ва ўмовах масавага кантролю; у невялікіх вучэбных групах рэйтынг немэтазгодны, бо тут ён менш эфектыўны.

Да ўліку вынікаў рэйтынгавай атэстацыі існуюць тры падыходы:

– адсутнасць уліку рэйтынгавай ацэнкі на экзамене (недавер педагога да рэйтынгу);

– інтуітыўны ўлік рэйтынгавай ацэнкі на экзамене;

– алгарытмізаваны ўлік рэйтынгавай ацэнкі на экзамене.

Вылучым функцыі рэйтынгавай сістэмы.

1. Кантралюючая і карэкціруючая. Студэнт сам сабе выстаўляе балы. Суб'ектыўнасць выкладчыка змяншаецца, але яна поўнасцю не выключана.

2. Кіруючая. Самая галоўная ўласцівасць ацэначнай сістэмы – уздзейнічаць на паводзіны як студэнта, так і выкладчыка. У выніку – актывізацыя працэсу навучання і выхавання.

3. Выхаваўчая, у тым ліку функцыя самавыхавання.

Характарызуючы рэйтынгавую сістэму, адзначым, што яна абавязкова павінна мець мэту. Яе мэта – гарманічнае развіццё асобы, павышэнне эфектыўнасці адукацыі. Мэта вызначае наступнае:

– кантоўнасці: гарманічнае развіццё грамадскіх адносін;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– падыход: гарманізацыя знешняга і ўнутранага «заказаў» на адукацыйны сервіс, пераход да канцэпцыі самавыхавання, саманавучання, самаразвіцця;

– парадыгму: суб'ект-суб'ектныя адносіны ў навучанні і выхаванні;

– прынцыпы: мэтазгоднасці, развіцця асобы, самавызначэння, «вырошчвання» здольнасцей, перавод сацыяльнага заказу ў катэгорыю самазаказу, маніторынг, празрыстасць вучэбна-выхаваўчага працэсу;

– змест навучання і выхавання: вызначаецца ў вучэбнай і рабочай праграмах у залежнасці ад пастаўленай мэты;

– метады: адаптацыі, індывідуалізацыі зместу адукацыі, дэлегавання адказнасці, самастойнасці выбару, стымулявання, спаборніцтва, актуалізацыі дзейнасці;

– сродкі: персанальны камп'ютэр, традыцыйныя сродкі навучання;

– форму: рэйтынгавы рэгламент.

Такім чынам, ва ўмовах выкарыстання рэйтынгавай сістэмы ўзмацняецца эфект зваротнай сувязі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе, узрастае роля матывацыйнага асяроддзя. Частка функцый педагога (матывацыйная, арганізатарская, карэкцыйная, кіруючая, выхаваўчая) цалкам ці часткова вырашаюцца ў рамках рэйтынгавага падыходу. Добра наладжаная арганізацыя работы выступае ў якасці сродку кіравання навучаннем студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ